# РЭГІЁН

**ГАРАДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ**

**№ 1 (11)**
**8 чэрвеня 2009 г.**
Інфармацыйнае выданне
Распаўсюджваецца бясплатна


# Адбылося паседжанне Рады Руху “За Свабоду”

**На паседжанні абмеркаваныя пытанні правядзення Беларускага еўрапейскага форума, супрацоўніцтва з АДС, а таксама прынятыя новыя сябры у ПАГА “Рух “За Свабоду”.**



На сходзе адзначана, што мэтай правядзення прадстаўнічага форума праеўрапейскіх сілаў, які запланаваны на лістапад, з’яўляецца аб’яднанне і мабілізацыя прыхільнікаў збліжэння Беларусі з Еўразвязам.

Напярэдадні форума мяркуецца правядзення сходаў у рэгіёнах шырокага фармату, на якіх будуць вылучацца дэлегаты. Плануецца дабівацца легальных сходаў у тым ліку ў памяшканнях раённых ДК і запрашаць на іх вядомых аналітыкаў, палітыкаў, эканамістаў.

Вылучэнне адзінага кандыдата ад дэмакратычных, альбо еўрапейскіх сілаў на форуме не запланавана. Паводле Аляксандра Мілінкевіча, падтрымка еўрапейскай стратэгіі мае больш шырокае кола прыхільнікаў, чым абранне канкрэтнага лідэра.

Па словах намесніка кіраўніка Руху “За Свабоду” Віктара Карнеенкі, зараз для дэмакратычных сілаў вельмі важна захаваць статус партнёра для Заходняй Еўропы. На кангрэсе павінна быць заяўлена, што ў Беларусі ёсць палітыкі, гатовыя ўзяць на сабе адказнасць за лёс краіны. Рух “За Свабоду” застаецца адкрыты для супрацоўніцтва з праеўрапейскімі сіламі. Зараз рыхтуецца зварот лідэра Руху “За Свабоду” з прапановай усім ахвотным далучыцца да працэсу падрыхтоўкі Кангрэса. Гуртаванне павінна адбывацца на прынцыпах аднолькавага стаўлення да еўрапейскіх каштоўнасцяў.

Паводле слоў намесніка кіраўніка Руху, зараз палітыку, каб мець падтрымку з боку беларусаў і Еўразвязу, недастаткова казаць, што ён нязгодны з уладамі. Дэмакратычныя сілы павінны прапанаваць канкрэтны план дзеянняў і тэхналогіі па яго ажыццяўленню. Іх мусіць прэзентаваць восеньскі форум.

– Мы абавязаны стаць генератарам новых ідэяў. Наша пазіцыя ясная – мы за крытычны і абумоўлены дыялог з Еўропай, у якім актыўна ўдзельнічае грамадзянская супольнасць. Акрамя маніторынгу сітуацыі з правамі чалавека, нам неабходна прапанаваць Еўразвязу канкрэтную стратэгію нашай дзейнасці ў партнёрстве з імі па дэмакратызацыі і лібералізацыі краіны. Калі мы гэта не зробім, у дыялогу будуць удзельнічаць толькі аб’яднаная Еўропа і ўлада, – лічыць Аляксандр Мілінкевіч.

Па словах Аляксандра Мілінкевіча, зараз група аналітыкаў працуе над стратэгіяй еўрапейскага шляху развіцця краіны. Важна, каб такая праграма была прынятая на Кангрэсе.

Па выніках абмеркавання на паседжанні Рады было прынятае рашэнне ініцыяваць правядзенне ў лістападзе Беларускага еўрапейскага форуму з мэтай мабілізацыі ўсіх прыхільнікаў еўрапейскага выбару і ўнесці на паседжанні аргкамітэту прапановы па правядзенню форума, парадку вылучэння кандыдатаў і каляндарнаму плану ягонай падрыхтоўкі.

Напрыканцы паседжання Рады ў шэрагі ПАГА “Рух “За Свабоду” былі прынятыя больш за сто новых сябраў з Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласьцей.

**Прэс-служба ПАГА “Рух “За Свабоду”**

## Ты не адзін! ДАЛУЧАЙСЯ!

Паважаныя сябры, Рух “За Свабоду” зарэгістраваны. Пачынайма актыўную дзейнасць! Запрашаем да супрацоўніцтва.

Калі Вы жадаеце далучыцца да дзейнасці Руха “За Свабоду” у сваім рэгіёне, тэлефануйце альбо пішыце смс на нумар:

+ 375 29 155 88 93 (Алесь).

Альбо пішыце на электронную пошту zasvabodu.hrodna@gmail.com



# Еўразвяз чакае Беларусь

**15 красавіка Аляксандр Мілінкевіч сустрэўся з актывістамі Воранаўскага раёна.**

Краязнаўцы, гісторыкі, настаўнікі з Радуні і Воранава больш трох гадзін абмяркоўвалі з Аляксандрам Мілінкевічам сітуацыю ў краіне, пытанні дзейнасці дэмакратычныхнных актывістаў на бліжэйшы час, стратэгію падчас будучых выбарчых кампаніяў.

У адказ на пытанне актывістаў пра стасункі з аб'яднанай Еўропай Аляксандр Мілінкевіч адзначыў, што Еўразвяз прыкладае намаганні, каб еўрапеізаваць Беларусь. "Што датычыцца адносінаў з Расіяй, то аб'яднанне з ёю азначае палітычную смерць краіны", - падкрэсліў палітык.

Таксама вялікую небяспеку для краіны нясуць сённяшнія крэдыты, атрыманыя ад Расіі, бо яны паглыбляюць эканамічную залежнасць ад усходняй суседкі.

– Трэба сказаць праўду пра рэальны стан справаў у краіне, прыняць антыкрызісную праграму рэфармавання эканомікі і развіваць нармальныя адносіны з цывілізаваным дэмакратычным светам, – зазначыў лідэр Руху "За Свабоду".

На выездзе з Радуні машыны, на якіх ехаў лідэр Руху «За Свабоду» і актывісты, былі спынены супрацоўнікамі ДАІ. Міліцыянты праверылі дакументы ў кіроўцаў і пасажыраў, паведамі́ўшы, што шукаюць злачынцу.

**Прэс служба Руху "За Свабоду"**

# Новая рэдакцыя статуту Руха "За Свабоду"

**Міністэрства юстыцыі зацвердзіла змены ў Статут ПАГА "Рух "За Свабоду", прынятыя на канферэнцыі арганізацыі, што адбылася 15 лютага 2009 года.**

- Новая рэдакцыя Статута дазваляе ствараць і рэгістраваць рэгіянальныя структуры ПАГА "Рух "За Свабоду", прадугледжвае спрошчаны парадак правядзення Канферэнцыі Руха (паводле ранейшай версіі патрабавалася прысутнасць не менш за палову сябраў, зараз магчыма дэлегаванне ад сходаў мясцовых арганізацый), - каментуе прынятыя змены намеснік старшыні арганізацыі Юрась Губарэвіч. - У Статуце прадугледжана магчымасць стварэння выканаўчай структуры - выканкама. Прыняты таксама і іншыя змены, сярод якіх магчымасць засноўваць уласныя СМІ; праводзіць сацыялагічныя даследаванні.

Юрась Губарэвіч адзначыў, што змены дазволяць арганізацыі легалізаваць дэ-факта створаныя і працуючыя ў рэгіёнах структуры.

**Прэс-служба Руху "За Свабоду"**

## Крухмальны завод у Мастоўскім раёне

**Каля вёскі Ляда, Мастоўскага раёну, пачаліся тапаграфічныя здымкі тэрыторыі, на якой плануецца пабудаваць сучасны крухмальны завод, аналагаў якога нібыта не будзе на ўсёй постсавецкай прасторы.**

Са словаў будаўнікоў прадпрыемства павінна распачаць сваю працу ўжо ў канцы гэтага году.

Плануецца, што на прадпрыемстве будзе выпускацца крухмал гатунку «экстра». 60 % прадукцыі якога плануецца пастаўляць на экспарт.

**http://masty.belarda.org**

## Суддзя палохала рабочых "Мастоўдрэва" спецслужбамі

**Спецслужбамі палохала рабочых суддзя ў Мастах. Двое былых рабочых дрэваперапрацоўчага заводу «Мастоўдрэў», аспрэчваючы сваё незаконнае звальненне, падалі ў суд на кіраўніцтва прадпрыемства. У Мастоўскім раённым судзе справу рабочыя прайгралі.**

Калі яны забіралі рашэнне суду, то суддзя чамусьці забылася прадставіць матывацыйную частку, нягледзячы на тое што рабочыя прасілі падрыхтаваць яе. Калі ж днямі рабочыя прыйшлі ў раённы суд за матывацыйнай часткай, то былі выкліканыя да суддзі Алы Боцькі.

У кабінеце суддзі яны даведаліся, што імі ўжо цікавяцца спецслужбы, і ўвогуле ім трэба падумаць аб сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей. Суддзя Боцька настойліва парэкамендавала падумаць некалькі разоў, ці патрэбны ім гэтыя дакументы і ці не баяцца яны праблемаў у будучыні.

**Ігар Аскірка, Еўрарадыё**



*Алесь Зарэмбюк тлумачыць уладам неабходнасьць неадкладнага вырашэньня праблем раёна*

# Зарэмбюк прымусіў уладу сустрэцца з народам

**У чыгуначным раёне Мастоў 25 год не бачылі начальства, якое прызвычаілася засядаць у выканкаме, хаця праблемаў у насельніцтва чыгуначнага раёна сабралася багата.**

Дзякуючы таму, што актывісты Руху "За свабоду" у рамках кампаніі "За Еўрапейскую Мастоўшчыну" падрыхтавалі калектыўны зварот, сабралі пад гэтым зваротам 232 подпісы жыхароў гэтага раёна прыватнай забудовы і накіравалі дакумант мясцовай ўладзе, размаўляць з людзьмі пасьля працоўнага дня прыехаў старшыня райвыканкама Аляксей Шафарэвіч, яго намеснік па пытаньнях камунальнай гаспадаркі і будаўніцтва Генадзь Снітко і дэпутат райсавета Віктар Шкляр. На сустрэчу прыйшлі каля ста чалавек.

Рэгіянальны каардынатар Руху "За Свабоду" у Гарадзенскай вобласьці Алесь Зарэмбюк паведаміў, што яны правялі кампанію, скіраваную на вырашэнне праблемаў насельніцтва. Перш за ўсё ад уладаў патрабавалі адрамантаваць вуліцы і зрабіць нармальнае асвятленне. Таму кіраўніцтва было вымушана адрэагаваць выехаўшы на месца. Напачатку старшыня райвыканкама так і сказаў: вось вы тут падпісалі зварот супраць улады, што тут шмат гадоў не вырашаюцца праблемы, таму мы прыехалі з вамі паразмаўляць. Гэтую нагоду кіраўніцтва Мастоўскага раёна выкарыстала, каб патлумачыць людзям, як будуюцца Масты, як у горадзе ўсё добра і як улада стараецца вырашаць існуючыя праблемы, адзначае Зарэмбюк.

Аднак людзі ў адказ наважыліся гаварыць і высветлілася: у іх ёсць процьма іншых праблемаў. Гаварылі пра беспрацоўе ў горадзе, пра істотнае змяншэнне заробкаў на асноўных прадпрыемствах раёна — "Мастоўдрэве" і ДП "Мастоўская сельгастэхніка". Асмялеўшы, расказалі пра тое, што ў мікрараёне няма лазні, што ў краме недастатковы асартымент неабходных прадуктаў, што дрэнна ходзіць аўтобус у цэнтр горада. Старшыня выканкама сказаў: вось тут ёсць ваш дэпутат, звяртайцеся да яго, вы яго ведаеце. Але людзі запярэчылі, што бачылі дэпутата Шкляра толькі на здымках перад выбарамі, а самога яго на вялікі жаль бачаць толькі першы раз.

У прысутнасці раённага начальства людзі мелі магчымасць пераканацца, што мы разам з імі змаглі дамагчыся капітальнага рамонту дарогі ад вуліцы 30 год ВЛКСМ да пераезда, якая дагэтуль на працягу шмат гадоў была ў аварыйным стане - падкрэсліў Алесь Зарэмбюк.

**Паводле http://regionby.org**

## У чаргу за кватэрай

**Нягледзячы на тое, што з кожным годам павялічваецца колькасць пабудаваных кватэраў, на ўліку жадаючых палепшыць свае жыллёвыя ўмовы у Гарадзенскай вобласці знаходзіцца 72 000 чалавек.**

Па дадзеных Гарадзенскага аблвыканкама, чарга на атрыманне кватэры ў вобласці складае ў сярэднім 15 гадоў. Асабліва востра недахоп жытла заўважны ў раённых цэнтрах, такіх як Ліда, Ваўкавыск, Наваградак і Слонім.

Апошнім часам вялікі адсотак камерцыйнага жытла ў горадзе над Нёманам застаецца незапатрабаваным: прычына палягае на высокіх коштах квадратнага метра, які перавышае 800 даляраў і адсутнасці крэдытавання.

**Радыё Рацыя**

## Мілінкевіч наведаў Астравец

**Падчас сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча з дэмакратычнымі актывістамі Астраўца 14 траўня была абмеркаваная антыядзерная кампанія і прынятае рашэнне пра стварэнне мясцовай структуры Руху "За Свабоду".**

Людзі распавялі лідэру Руху "За Свабоду" пра ход кампаніі "Астравецкая атамная – гэта злачынства". Мясцовыя жыхары, нягледзячы на запалохванні раённых уладаў, у гутарках выказваюць незадаволенасць будаўніцтвам атамнай станцыі на Астравеччыне. У той жа час, паводле афіцыйнай інфармацыі, 70% выказваюцца за будаўніцтва станцыі. Такое разыходжанне мясцовы дэмакратычны актывіст Іван Крук тлумачыць тым, што людзі баяцца адкрыта выказваць сваё меркаванне датычна АЭС на сходах працоўных калектываў, ініцыяваных уладамі. Тым, хто наважваецца публічна выказацца супраць будаўніцтва, чыноўнікі не знаходзяць, што запярэчыць.

Заява з 300 подпісаў супраць пабудовы станцыі разасланая зацікаўленым ведамствам і ў вышэйшыя структуры ўлады. Па словах актывіста Івана Крука, магчыма ў тым ліку дзякуючы шырокай антыядзернай кампаніі на дадзены момант тэмпы узвядзення жылля для будаўнікоў Астравецкай АЭС прыкметна зменшыліся.

Людзі на сустрэчы таксама задавалі пытанні адносна развіцця стасункаў Еўразвязу і Беларусі, скардзіліся на маленькія заробкі і пенсіі

Пасля размовы з Аляксандрам Мілінкевічам, мясцовыя актывісты вырашылі стварыць структуру Руху "За Свабоду" у Астраўцы. Па словах Івана Крука, зараз рыхтуюцца адпаведныя дакументы і вырашаюцца некаторыя пытанні.

**Прэс – служба "Руху "За Свабоду"**

# Руководители предприятий лгут

**Делают они это якобы в интересах борьбы с кризисом. Но ложь толкает жителей Гродненщины и на ложные шаги по его преодолению.**




Директора предприятий отказываются говорить, а чиновники отмахиваются фразой: “Мы делаем все возможное, чтобы…” – такова пока белорусская картинка кризиса.

А между тем кризис обволакивает буквально все производства, и официальная статистика Гродненщины вынуждена признать: за три месяца года было продано всего около 9 процентов произведенной продукции.

Затрещали по швам все прогнозные показатели, в том числе темпы роста объёмов промышленного производства. Они упали в среднем от 8 до 15 процентов. С начала года объем производства сократили 93 предприятия области – почти 40 процентов от их общего количества. Это тоже официальная статистика, а поскольку ей никто не верит, то “государственную” цифру вполне можно доводить до 50 процентов.

Но пройдет месяц-другой, и ее можно будет удваивать, если опять исходить от количества продаж сделанного производственниками. Товар не продается, какой смысл работать на склады – они не дают оборотных средств.

Объёмы выпускаемой продукции снизили все стабильно работающие до сих пор заводы и фабрики, в том числе “Мостовдрев” ,“Белкард”, “Радиоволна”, “БелТАПАЗ”, “Автопровод”, и десятки других предприятий. Их руководители всячески недоговаривают реальную ситуацию на своих предприятиях, но через пару месяцев скрывать будет уже нечего, так как нечем станет платить зарплату работающим.

Чтобы снизить финансовые издержки, переходят на неполный рабочий день или неполную рабочую неделю, отпускают в незапланированные отпуска. В таком режиме уже работает около 80 предприятий области, и к ним присоединяются все новые и новые жертвы кризиса. В последнее время это обувная и табачная фабрики, завод токарных патронов, “Торгмаш”.

Впрочем, и руководителей предприятий, и чиновников, курирующих эти отрасли, можно понять: скажи правду и на фоне “успокаивающих” высказываний президента в одночасье покинешь руководящее кресло. Поэтому все и молчат, и врут, только чтобы протянуть затмение реальной ситуации. Все апеллируют ложью, не осознавая до конца последствия кризиса. А ведь он, по прогнозам специалистов, только начался, и есть все симптомы при скрываемой реальности вообще из него не выйти. Потому что ложь толкает и на ложные шаги по его преодолению.

Удивительна и вот еще какая черта белорусской экономики. Ладно, пусть миминизируют и замалчивают потери государственные предприятия. Так нет же – и предприниматели, и частные производители всячески уклоняются от разговоров и обнародования своих реально-производственных ситуаций. А между тем останавливаются в первую очередь малые и средние частные производства. Если говорить о Гродненщине, то в прострации оказались в первую очередь мебельные производства. Если в начале года работали еще на заказах прошлого, то теперь мебельщики констатируют: их вообще нет. Директор “Мастербела” Сергей Белый пояснил все кратко и ясно – “это товары не первой необходимости. Без нового шкафа прожить можно, а вот без хлеба на столе нельзя. Люди начали экономить на всем…”

Если предположить, что уже закрылось несколько, более мелких мебельных производств в самом Гродно, то можно лишь догадываться, какие мысли насчет перспектив закрадываются в голове руководителя “Мастербела”.

Но, повторяю, это всего лишь цветочки. Обострение кризиса будет происходить осенью, и какой плод вызреет к концу года – лучше не загадывать. К тому времени международные кредиты закончатся… И вот тогда все молчащие завопят оправдательно на всю Ивановскую: “Так ведь у нас кризис!.. “, спасая опять же не страну и свои производства, а свои руководящие кресла.

**Алесь Васильков,**
**regionby.org**

# Пра беспрацоўе на Гарадзеншчыне

**Яшчэ толькі месяц назад намесніца загадчыка Упраўлення па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва гарадзенскага аблвыканкама Людміла Гез гаварыла, што сітуацыя на рынку працы стабільная і трымаецца на ўзроўні мінулага года.**




Іншымі словамі, вакансіяў было больш, чым саміх беспрацоўных. Але вось прайшоў месяц, і сітуацыя рэзка змянілася: цяпер колькасць беспрацоўных у паўтара раза перавышае колькасць вакансіяў, якія можа прадаставіць гарадзенскі Цэнтр занятасці насельніцтва.

Паводле словаў яго супрацоўнікаў, гэта тлумачыцца тым, што кіраўнікі прадпрыемстваў пры памяншэнні аб'ёмаў вытворчасці не хочуць набіраць новых працаўнікоў, таму інфармацыю аб вакансіях на сваіх прадпрыемствах проста не падаюць у Цэнтр. Ёсць і яшчэ адметная рыса крызісу, якая была дагэтуль не характэрнай: больш сталі шукаць працу мужчыны, хаця раней першынство ўтрымлівалі жанчыны.

Супрацоўнікі Цэнтра знаходзяць сваё тлумачэнне і гэтай з'яве: маўляў, скарацілі выпуск прадукцыі, у першую чаргу, «мужчынскія» прадпрыемствы, тыя, што займаюцца металаапрацоўкай і выпускам мэблі. Да таго ж ёсць тут і псіхалагічнае апраўданне: мужчыны па-ранейшаму лічацца кармільцамі сям'і, таму больш энергічна і напорыста шукаюць вышэйшых заробкаў.

Менавіта гэта – дастойная праца і дастойныя чалавека заробкі – прывялі ў Цэнтр занятасці маладога гарадзенца Сяргея. Паўтара года ён адпрацаваў на ААТ «Зоўеўрамэбля» і сыходзіць нікуды не збіраўся. Аднак апошнія месяцы попыт на прадукцыю прадпрыемства рэзка ўпаў. Рабочыя працуюць па паўмесяца, бяруць водпускі за свой рахунак. Жонка Вольга таксама не можа пахваліцца высокай зарплатай. Яна працуе прадавачкай гародніны на рынку і не мае стабільнага заробку. А ён, дарэчы, паніжаецца, таму што даходы пакупнікоў таксама паменшыліся.

– Сёння, каб хоць крышку дастойна жыць, – гаворыць Сяргей, – маладая сям'я павінна атрымліваць не менш за 2 мільёны рублёў, таму што цэны скачуць няспынна. Да таго ж у нас маленькі сын: трэба аплачваць садзік, набываць вопратку, а пра харчаванне і ўвогуле гаварыць не хочацца. Мы ўдваіх атрымлівалі ў апошнія месяцы каля мільёна. Дык большая частка грошай трацілася на прадукты. А нам жа хочацца і адпачыць, і схадзіць куды-небудзь у вольны час. Цяпер не выходзіць.

Каб выкараскацца з няпростай сітуацыі, маладыя бацькі вырашылі спыніцца на вучобе Сяргея на курсах газаэлектразваршчыкаў пры Цэнтры занятасці, таму што будаўнічая галіна пакуль што найменей за іншыя адчула на сабе ўплыў крызісу. Праз 5-6 месяцаў Сяргей атрымае пасведчанне, але да гэтага сям'і прыйдзецца жыць толькі на зарплату Вольгі. Будзе цяжка, яны гэта разумеюць. А між тым, крызіс у Беларусі, напэўна, толькі пачынаецца.

**bulletinonline.org**

## Пісаць пра крызіс небяспечна

**Івана Романа з Гродна, які працуе для «Радыё Рацыя», пасля папярэджання за яго журналісцкую дзейнасць у пракуратуры, атрымаў другое – цяпер у КДБ.**

Калі журналіста даставілі ў абласную управу КДБ, яму паказалі цэлую папку з яго артыкуламі, узятымі з інтэрнэта.

– Іх там было прыблізна дваццаць-трыццаць ці нават болей, – прызнаўся нам Іван Раман.

Журналісту сказалі што сваімі матэрыяламі ён нібыта парушае артыкул 369, I Крымінальнага кодэкса, паводле якога яго могуць нават прыцягнуць да адказнасці.

Іван Роман:

– Іх больш за ўсё цікавіла тое, што я негатыўна асвячаю становішча ў эканоміцы. Напрыклад, што датычыць цяперашняга стану шклозавода «Нёман» у Бярозаўцы ці завода карданных валаў у Гродне. Яны лічаць: не так усё кепска, як паведамляю я. Але калі, напрыклад, у матэрыяле ўтрымліваецца інфармацыя аб тым, што на шклозаводзе несвоечасова выплочваюць заробкі, то гэта насамрэч так. Тое, што завод неплацёжаздольны і дзеля таго, каб выплаціць заробкі, бяруць крэдыты, гэтая інфармацыя афіцыйна пацверджана старшынём прафкама прадпрыемства.

У папярэджанні было яшчэ пазначана, што Іван Роман з 24 красавіка бягучага года знаходзіцца ў аператыўнай распрацоўцы органаў КДБ.

Журналіст запытаў: што гэта азначае? Яму адказалі: тваю дзейнасць адсочваюць, каб ты не прымушаў узбуджаць супраць цябе крымінальную справу.

– Яны параілі мне пісаць толькі тое, што добра, што ў нас усё добра. «Але так пісаць я не ўмею!» «То можам прапанаваць табе перакваліфікацыю», –сказалі яны. я адмовіўся, хаця чэкісты і не патлумачылі, што маюць на ўвазе пад гэтай «перакваліфікацыяй».

Аб тым, што ён папярэджаны, журналіст распісаўся і папрасіў копію паперы, але яму сказалі, што «гэтая ўстанова ніякіх копій не дае».

– Яны папярэджваюць, а ты сам рабі высновы, - падсумаваў Іван Роман.

**Алесь Кавалёў,**
**regionby.org**

# Мілінкевіч наведаў Бярозаўку і Ваўкавыск

**Лідэр Руху «За Свабоду» на гэтым тыдні ажыццяўляе паездкі па мясцінах, якія не ўдалося наведаць падчас леташняй выбарчай кампаніі ў Палату Прадстаўнікоў.**

Паводле мясцовых прыхільнікаў Руху, людзі чакаюць пераменаў і пры належнай кампаніі гатовыя падтрымаць дэмакратычнага кандыдата на выбарах.

На сустрэчы былі пераважна работнікі шклозавода «Нёман». Яны распавядалі пра праблемы з мадэрнізацыяй вытворчасці, злоўжыванні кіраўніцтва, пра намер у сувязі з крызісам, спыніць адну з двух пастаянна працуючых заводскіх печаў. Па словах удзельнікаў сустрэчы з 2007 года заробак у рублях практычна не змяніўся.

Людзі таксама казалі пра праблемы мясцовай сістэмы аховы здароўя: у лякарні пацыенты вымушаны ўсё ад лекаў і бінтоў да фізраствораў і шпрыцаў купляць самі. Гараджане ўсё часцей выказваюць незадаволенасць і гатовыя да пераменаў у палітычным жыцці.

Актывісты ў размове з Аляксандрам Мілінкевічам пазнаёмілі са сваім выданнем «Вольная Бярозаўка», якое робяць і распаўсюджваюць саматужна, распавялі пра свае спробы ўвекавечыць памяць ксяндза Адама Фалькоўскага, які ў 1863 годзе зачытаў маніфест паўстання Кастуся Каліноўскага.

На Ваўкавыскай сустрэчы Аляксандр Мілінкевіч у сваёй прамове адзначыў, што зараз імкліва павялічваецца эканамічная залежнасць Беларусі ад Расіі, якая пагражае нашай краіне паглынаннем. Еўразвяз гатовы дапамагчы нам супрацьстаяць гэтаму. Ён прапануе праграму «Усходняе партнёрства», згодна з якой Беларусь мусіць праводзіць эканамічныя рэформы і ажыццяўляць змены ў заканадаўстве, набліжаючы яго да стандартаў цывілізаванай Еўропы. У якасці выразных крокаў насустрач прапануецца спрашчэнне візавага рэжыму для грамадзян і стварэнне зоны свабоднага гандлю.

Пакуль што уваходу Беларусі ў Еўразвяз перашкаджае аўтарытарызм. На думку лідэра Руху «За Свабоду», мы павінны навучыцца адстойваць свае правы, самаарганізоўвацца, ставіць асобныя, зразумелыя мэты, дабівацца



вырашэння канкрэтных лакальных праблемаў, то бок актывізаваць стварэнне грамадзянскай супольнасці.

Намеснік кіраўніка Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч адзначыў, што хоць большасць сябраў Руху беспартыйныя, арганізацыя з'яўляецца добрай пляцоўкай для супрацы актывістаў шэрагу палітычных партый. Актывісты ПАГА Рух «За Свабоду» ёсць у шасцідзесяці гарадах краіны. Яны у сваёй дзейнасці робяць упор на вырашэнне лакальных праблемаў.

– Палітыкі павінны не толькі ацэньваць сітуацыю у краіне, але і рабіць рэальныя рэчы, – лічыць Юрась Губарэвіч.

Мясцовыя прыхільнікі скардзіліся, што у Ваўкавыску не хапае інфармацыі пра культурніцкія акцыі, дрэнна вядзецца арганізацыйная праца з моладдзю, няма мясцовай газеты.

Намеснік кіраўніка Руху «За Свабоду» паведаміў, што арганізацыя будзе падтрымліваць друкаванне мясцовага бюлетэня, аказваць адукацыйную дапамогу, праводзіць асветніцкую дзейнасць, папулярызаваць ідэі незалежнасці, еўрапеізацыі, дэмакратычныя каштоўнасці.

Напрыканцы сустрэчы жыхарам Ваўкавыску перадалі брашуры і асобнікі апошняга выпуску газеты «Новы час».

Перад ад'ездам Аляксандр Мілінкевіч з актывістамі наведаў крыж, усталяваны на месцы былой уніяцкай царквы і мясцовую славутасць Шведскую гору. Падчас знаходжання лідэра Руху «За Свабоду» ў горадзе, яго перамяшчэнне адсочвалі супрацоўнікі зацікаўленых спецслужбаў.

## Адбылася сустрэча Мілінкевіча с прем’ер-міністрам Нідэрландаў

**Падчас свайго візіту ў Варшаву 30 красавіка 2009 года лідэр Руху “За Свабоду” абмеркаваў з кіраўнікам ураду Галандыі шырокі спектр праблемаў.**

Падчас сустрэчы прэм’ер-міністра Нідэрландаў Яна Петэра Балкенэндэ і Аляксандра Мілінкевіча абмяркоўваліся напрамкі рэалізацыі праграмы Усходняга партнёрства, эканамічная і палітычная сітуацыя ў Беларусі, праблемы захавання суверэнітэту краіны і праблема парушэння правоў чалавека.

**Ул. інф.**

## Перад выбарам: ці супрацоўніцтва з КДБ – ці Чарнобыль з арміяй

**Бесцырымонным ціскам на мастоўскага актывіста Руху “За свабоду” студэнта Алега Пронскага перасцерагаюць ад іншадумства іншых маладых людзей.**

Хлопец закончыў аграрны універсітэт у Гродне, чаму ж не прызваць яго ўжо зараз? Але ён паказаў паперы, што атрымлівае паралельна другую спецыяльнасць у гэтай жа ВНУ і трэба давучыцца да канца года. У ваенкамаце неахвотна выдалі яму ўжо накіраванне на медыцынскую камісію, якая мае адбыцца амаль праз паўгода — 6 кастрычніка.

Алег лічыць, што пройдзе восеньскую камісію, і як толькі закончыць курс эканамічнага менеджэра, яго забяруць у армію. Гэта – чарговая мера пакарання для яго.

Хлопца ўжо дапытвалі ва універсітэце два афіцэры КДБ, патрабавалі, каб адмовіўся ад актыўнай дзейнасці ў дэмакратычных арганізацыях, схілялі да супрацоўніцтва, пагражалі, што накіруюць яго на працу пасля заканчэння ўніверсітэта ў Гомельскую вобласць. У Гомельскую не паслалі, але накіраванне замянілі: было ў эксперыментальную базу “Руткевічы” побач са Шчучынам, ад якога недалёка да Мастоў, а цяпер выдалі “пуцёўку” за дзвесце кіламетраў ад Гродна — у Ашмянскі раён.

Дарэчы, Алег Пронскі звярнуўся пісьмова ў аддзел кадраў Аграрнага універсітэта, каб патлумачылі: на якой падставе яму змянілі размеркаванне? Паколькі сам з такой просьбай пераразмеркаваньня не звяртаўся, яго цалкам задавальняла перспектыва працы ў Руткевічах. Адказу не атрымаў, замест гэтага пачалі турбаваць супрацоўнікі мастоўскага ваенкамата.

**Паводле regionby.org**

# Уважаемые читатели издания “РЭГІЁН”!

**Многих из нас в первую очередь тех, кто не согласен с существующей властью, называют аппозиционерами, бэнээфовцами, а в последнее время и врагами народа.**

Так кто же мы такие и чего требуем от нынешней власти?

Для начала, мы требуем честных и справедливых выборов.

То, что в Мостовском районном Совете депутатов 24 созыва работали независимые депутаты А. Зарембюк и А. Пудовкин, так это больше исключение.

Просто мы прорвались сквозь круговую оборону вертикали. И даже вдвоем приносили немало неприятностей для власти, и пользы, для своих избирателей добиваясь решения проблем и требуя ответов на многие неприятные вопросы.

Что же делали большинство депутатов райсовета?

Просто ждали, когда быстрее закончится сессия.

Вы спросите, а что же вдруг случится при проведении честных и справедливых выборов?

Просто в районный Совет депутатов может быть выбрано 10 либо 20 таких, как Зарембюк или Пудовкин . Независимых депутатов, которые зависят только от своих избирателей и им подотчётны.

Естественно, к мостовским чиновникам будет предъявлено ряд претензий.

Почему закрываются магазины, Фапы , сельские больницы, почему не ремонтируются улицы в так называемых агрогородках и даже в Мостах. Почему в Мостах не ремонтируют окраины города, почему «Мостовдрев» наладом дышит, почему на сельхозтехнике в 3 раза упала зарплата???

Власятям придётся обьяснить, куда расходуются средства районного бюджета по каждому пункту. И почему деньги районного бюджета расходуются неэффективно?



KAMUNIKAT.org

Что – либо обьяснять нашим засидевшимся чиновникам не хочется, а тем более отвечать. А чтобы не делать ни того, ни другого, проще просто не пропускать в райсовет ни Пудовкина ни Зарембюка, ни других представителей демократического лагеря и несогласных . К тому же, для надежности их можно еще и обозвать по разному.

Пока люди разберутся, пройдет время.

А теперь, о том, чего же депутат Пудовкин, по вертикальному оппозиционер, требует от районной власти и не только ?

Например, за март месяц в Мостовский райисполком направлено 5 обращений.

О чем же они. Одно из обращений направлено руководству ОАО Гроднохлебопродукт, об организации доставки рабочих служебным транспортом на работу из Лунно в Скидель. Такое же обращение направлено и в Мосты для ходатайства .

Еще одно обращение направлено в Мосты с требованием о ремонте улицы Комсомольская и моста, который в местечке Лунно.

В следующем обращении - просьба продлить работу Лунненского клуба, ведь Лунненской молодёжи вечером некуда деваться . Еще в одном обращении требование о ремонте актового зала Лунненского сельсовета, коллективное письмо жителей с химии Лунно с просьбой о газификации этой территории. Стали жители спрашивать новые телефонное справочники снова обращение в райисполком, издайте новый справочник. От этого будет польза всем жителям района.

Где же в этих обращениях выступления против жителей ?

Быстрее, эти инициативы направлены для людей и на их благо. Это именно то, что очень пугает вертикаль, ибо Пудовкин реально заступается за простых жителей, причем часто выступая совместно и многого от власти добиваясь.

Впрочем, в следующем номере издания “РЭГІЁН” я расскажу Вам, чего нам удалось добиться в Лунно вместе с жителями.

Поверьте, есть что рассказать и чем поделиться.

**С уважением,**
**депутат Лунненского сельского Совета,**
**Александр Пудовкин**

## Спецслужбы сарвалі музычную імпрэзу

**Віцебскі гурт “Паўночны Воўк” меўся прэзентаваць у Мастах новую беларускамоўную праграму.**

Канцэрт быў арганізаваны актывістамі арганізацый ПАГА “Рух ”За Свабоду” і Правы Альянс. Былі вырашаны ўсе арганізацыйныя пытаньні і запрошаныя прыхільнікі творчасці музычнага калектыва з Ліды, Слоніму, Ваўкавыску, Горадні, Шчучына і Мастоў.

Аднак, 8 красавіка на аднаго з музыкаў гурта выйшлі прадстаўнікі спецслужбаў і настойліва “парэкамендавалі” адмовіцца ад удзелу канцэрту у Мастах.

Падчас гутаркі былі агучаныя магчымыя варыянты развіцця падзей: затрыманне выступоўцаў, спыненне мерапрыемства амонаўцамі з далейшай “распрацоўкай” людзей датычных да канцэрту спецчлужбамі, правакацыі.

У выніку арганізатарамі канцэрта было прынятае рашэнне аб пераносе культурнага мерапрыемства на невызначаны тэрмін ў сувязі з магчымымі рэпрэсіўнымі наступствамі на аматараў творчасці гурта і арганізатараў канцэрта.

– Мы спадзяемся, што такія інцыдэнты застануцца адзінкавымі, а не перарастуць у паслядоўны уціск беларускай культуры, – кажа рэгіянальны каардынатар ПАГА “Рух ”За Свабоду ” у Гарадзенскай вобласьці, Алесь Зарэмбюк.

**Прэс – служба Руху “За Свабоду”**

**РЭГІЁН**
Інфармацыйнае выданне
**№ 1 (11) 8 чэрвеня 2009 г.**
Надрукавана ў друкарні
ААТ “Смоленская печать”
г. Смоленск
ул. Ломоносова д.3
Распаўсюджваецца бясплатна
Наклад 299 асобнікаў
**Адказны рэдактар:**
**Зьміцер Васілеўскі**

# Урокі Еўропы

**Актывісты Руху «За Свабоду» падаравалі шэрагу бібліятэк Гарадзеншчыны брашуры “Еўропа ў 12 уроках”.**



Актывісты ПАГА “Рух “За Свабоду” перадаліўваўкавыскія, шчучынскія і мастоўскія бібліятэкі 49 асобнікаў брашуры з такой назвай аўтарства французскага прафесара інстытута палітычных даследаванняў Паскаля Фантэйна.

– Якая мэта Еўразвязу? Чаму і як ён быў створаны? Як працуе? На гэтыя і іншыя пытанні можна атрымаць адказы, прачытаўшы гэтую брашуру. Акцыя ладзілася з мэтай падтрымкі ідэі дыялогу паміж Беларуссю і Еўразвязам, пашырэння інфармацыі сярод жыхароў Гарадзеншчыны аб Еўрапейскай інтэграцыі, функцыянаванні Еўрапейскага Звязу, – кажа сябра Рады ПАГА “Рух “За Свабоду” Алесь Зарэмбюк.

Актывісты ПАГА “Рух “За Свабоду” прэзентавалі Мастоўскай раённай бібліятэцы 15 асобнікаў брашуры, а таксама 3 асобнікі для школьнай бібліятэкі пятай сярэдняй школы горада Масты. У Шчучыне 15 асобнікаў брашуры атрымала Шчучынская цэнтральная раённая бібліятэка імя Цёткі, у Ваўкавыску 16 асобнікаў кнігі былі размеркаваны паміж раённай, гарадской, дзіцячай бібліятэкаў і бібліятэкай Ваўкавыскага педагагічнага каледжа.

**Прэс- служба ПАГА “Рух”За Свабоду”**

# Мастоўскія чыноўнікі лічаць беларускую мову другаснай?

**Рэгіянальнаму каардынатару Руху “За Свабоду” у Гарадзенскай вобласьці Алесю Зарэмбюку паведамілі пра немагчымасьць распрацоўкі беларускамоўнай версіі афіцыйнага сайта Мастоўскага райвыканкама.**

Старшыня Мастоўскага райвыканкама А. Шафарэвіч паведаміў сябру Рады руху “За Свабоду” Алесю Зарэмбюку, што асноўнай версіяй афіцыйнага сайту мясцовых уладаў з’яўляецца рускамоўная. Чыноўнік у сваім лісце, нібыта апраўдваючыся, спасылаецца на нарматыўныя дакументы і кантэнт сайтаў іншых раёнаў Гарадзеншчыны, якія, паводле ягоных слоў, змяшчаюць інфармацыю па-руску. Паводле Шафарэвіча, рэгламент інфармацыйнага напаўнення афіцыйнай інтэрнэт-старонкі прадугледжвае размяшчэнне інфармацыю па-беларуску і па-ангельску, але пераклад асноўнай (рускамоўнай) версіі сайта на мову тытульнай нацыі не плануецца.

Такім чынам, спраўджваюцца самыя песімістычныя прагнозы мовазнаўцаў: наданне расейскай мове статуса дзяржаўнай нароўні з беларускай прывяло да выцяснення апошняй не толькі з паўсядзённых стасункаў паміж людзьмі, са сфер адукацыі, навукі, культуры, але нават з афіцыйных дачыненняў дзяржавы і грамадзяніна. Калі чыноўнік не здольны выказаць свае думкі на дзяржаўнай мове, калі суддзя пераносяць разгляд справы з прычыны неразумення мовы тытульнай нацыі, – сітуацыя немагчымая ў любой іншай краіне – у Беларусі выглядае як норма.

**Антон Верамейчык**